Мінск, 1 лютага 2017 года

Ваша Экселенцыя,

Прыміце мае шчырыя віншаванні з нагоды 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Арабскай Рэспублікай Егіпет.

За чвэрць стагоддзя мы здолелі закласці трывалую аснову для паслядоўнага і актыўнага дыялогу.

Мне асабліва прыемна адзначыць высокую дынаміку кантактаў паміж нашымі краінамі. Сустрэча Прэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь і Арабскай Рэспублікі Егіпет у студзені бягучага года ў Каіры яскрава пацвердзіла наша агульнае імкненне да далейшага паглыблення двухбаковага супрацоўніцтва і плённага ўзаемадзеяння на міжнароднай арэне.

Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі мы значна пашырым беларуска-егіпецкія сувязі і здолеем у поўнай меры рэалізаваць істотны патэнцыял узаемавыгаднага супрацоўніцтва, асабліва ў гандлёва-эканамічнай сферы.

Прыміце, Ваша Экселенцыя, найлепшыя пажаданні моцнага здароўя, шчасця і поспехаў, а таксама запэўненне ў маёй вельмі высокай павазе.

Уладзімір Макей